Частное учреждение образования
«Институт современных знаний имени А. М. Широкова»

Факультет гуманитарный
Кафедра менеджмента и коммуникаций

СОГЛАСОВАНО
Заведующий кафедрой
Мотульский Р. С.
____________________
25.06.2025 г.

СОГЛАСОВАНО
Декан факультета
Иноземцева И. Е.
____________________
25.06.2025 г.

# ЭТНОГРАФИЯ, МИФОЛОГИЯ И ФОЛЬКЛОР БЕЛОРУСОВ

*Электронный учебно-методический комплекс
для обучающихся специальности
6-05-0314-03 Социально-культурный менеджмент и коммуникации*

Составитель
Углик И. Г., доцент кафедры менеджмента и коммуникаций Частного учреждения образования «Институт современных знаний имени А. М. Широкова», кандидат исторических наук

Рассмотрено и утверждено
на заседании Совета гуманитарного факультета
протокол № 2 от 30.09.2025 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

УДК 39(476)(075.8)

Р е ц е н з е н т ы:

кафедра философии и логики учреждения образования «Минский государственный лингвистический университет» (протокол № 11 от 18.06.2025 г.);

*Бобрович В. И.*, доцент кафедры истории и социальных наук государственного учреждения образования «Минский государственный лингвистический университет», кандидат философских наук.

Рассмотрено и рекомендовано к утверждению
кафедрой менеджмента и коммуникаций
(протокол № 12 от 29.05.2025 г.)

Э91 **Углик, И. Г.** Этнография, мифология и фольклор белорусов : учеб.-метод. комплекс для обучающихся специальности 6-05-0314-03 Социально-культурный менеджмент и коммуникации [Электронный ресурс] / Сост. И. Г. Углик. – Электрон. дан. (0,5 Мб). – Минск : Институт современных знаний имени А. М. Широкова, 2026. – 86 с.

Систем. требования (миним.): процессор с частотой 1 ГГц, 1 ГБ оперативной памяти, 1 ГБ свободного места на жестком диске ; персональный компьютер под управлением ОС Microsoft® Windows® 7 и выше ; macOS® Leopard® и выше или мобильное устройство под управлением Android® 4.x и выше ; iOS® 9.x и выше ; Adobe Reader для соотв. ОС (или аналогичное приложение для чтения PDF-файлов).

Номер гос. регистрации в РУП «Центр цифрового развития» 1132646037 от 09.02.2026 г.

Учебно-методический комплекс представляет собой совокупность учебно-методических материалов, способствующих эффективному формированию компетенций в рамках изучения дисциплины «Этнография, мифология и фольклор белорусов».

Для студентов вузов.

ISBN 978-985-547-533-1

Ó Институт современных знаний имени А. М. Широкова, 2026

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

# Введение

Целевые ориентиры учебной дисциплины определяются нормативными требованиями к содержанию и уровню подготовки для получения первой ступени высшего образования. Они связаны с развитием профессиональных навыков обучаюшихся, формированием у них знаний и умений, необходимых как для профессиональной деятельности, так и для повышения общей компетентности и уровня культуры.

Этнография, мифология и фольклор являются основными дисциплинами при изучении традиционной (народной) культуры этноса. Они охватывают широкий спектр вопросов этногенеза, этнической истории, типов материальной и духовной культуры народа. Этнографический материал составляет существенную часть музейной коллекции краеведческих, этнографических музеев.

**Цель курса** – изучение этнографии, мифологии и фольклора Беларуси; формирование у обучающихся современных способов и приемов профессиональной деятельности и формирование культуры личности будущих специалистов в системе общего и профессионального образования.

**Задачи курса:**

– определить понятий этнографии, мифологии, фольклора;

– выявить основные виды этнических общностей;

– изучить этногенез и этапы этнической истории белорусов;

– изучить традиционную материальную культуру белорусов;

– изучить обычаи и обряды белорусов;

– изучить мифологию белорусов;

– изучить фольклор белорусов;

– выявить этнокультурную специфику традиционной культуры белорусов.

Дисциплина «Этнография, мифология и фольклор белорусов» входит в комплекс исторических дисциплин, таких как «Археология», «История», «Нумизматика», «Краеведение», другие.

После изучения курса студент **должен знать:**

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

– основные теоретико-методологические проблемы, категории этнографии, мифологии и фольклора;

– научные подходы к анализу этнических явлений;

– специфику этнических процессов, тенденции развития современного мира.

Студент должен **уметь:**

– использовать идеи и категории этнологии при анализе мировоззренческих, социокультурных и профессиональных проблем и ситуаций;

– оценивать перспективы развития современных этнических процессов, предлагать пути разрешения возникающих этнических проблем.

Студент должен **владеть:**

– основными методами этнографического, фольклорного исследования, изучения мифологии.

– основными приемами анализа специфики этнических процессов в Беларуси и современном мире.

– методами и приемами сбора полевого этнографического материала;

В основу отбора содержания курса и его структурирования положены следующие принципы:

– **принцип научности**, требующий рассмотрения этнографии и этнологии в качестве предмета объективного научного исследования в их системных и динамичных формах со специфическим понятийным аппаратом;

– **принцип связи теории с практикой**, предполагающий ориентацию теоритического знания на решение практических задач;

– **принцип системности**, предполагающий изучения предмета как структуированного целого с устойчивыми элементами, обеспечение единства отдельных частей курса, взаимосвязи основных понятий, связи с другими учебными дисциплинами и предметным блоками.

– **принцип историчности, предполагающий рассмотрение** предмета как видоизменяющейся в культурно-историческом поле системы.



РЕПОЗИТОРИЙ МСЗ

**Содержание дисциплины** базируется на основных отечественных и зарубежных методологических подходов в этнографии, мифологии и фольклоре, работах Э. Тэйлора, Дж. Фрэзера, К. Леви-Стросса, Л. Леви-Брюля, Б. Малиновского, О. Фробениуса, В. Проппа, Ю. Бромлея, других. Фактографическая база основывается на работах этнографов XIX – XX вв. А. Сержпутовского, Е. Карского, Н. Никифоровского, П. Бессонова, В. Василевича, других.

В ходе обучения применяются технические средства обучения – видео, аудиоматериалы (записи аутентичного фольклора).

**Основные формы организации обучения и разнообразие видов учебной деятельности**.

В процессе преподавания дисциплины используются следующие формы и методы обучения и воспитания:

– учебная лекция;

– семинарские и практические занятия;

– проблемная беседа, коллоквиум;

– управление научной и творческой работой (разработкой и проведением лекционных, семинарских и практических занятий, мультимедийных презентаций, разработкой и подготовкой дидактических материалов к занятиям и др.).

**Рекомендованные формы самостоятельной работы обучающихся**

– выполнение тестовых заданий;

– написание письменной контролной работы, эссе;

– конспектирование обязательной литературы к семинарским занятиям, работа с первоисточниками;

– использование интернет-ресурсов: поиск информации в сети, использование баз данных информационно-поисковых и информационно-справочных систем;

**Средства диагностики результатов учебной деятельности**

Для оценки достижений магистранта используется следующий диагностический инструментарий:

– тестирование;

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

– устный и письменный опрос во время практических занятий;

– защита выполненных на практических занятиях индивидуальных заданий;

– выступление на конференции по подготовленному реферату;

– сдача экзамена по дисциплине.

Подготовка студента ведется в соответствии с требованиями А 4-3, САК–1, ПК – 12.

Форма получения высшего образования – очная, заочная.

Форма текущей аттестации по дисциплине – зачет.

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

# 1. ТЕОРЕТИЧЕСКИЙ РАЗДЕЛ

## ЗМЕСТ ЛЕКЦЫЙНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## (курс лекцый)

### Тэма 1. Паняцці традыцыйна-бытавой культуры

Этнаграфія, міфалогія, фальклор вывучаюць у асноўным традыцыйную культуру. Традыцыйна-побытавая культура беларусаў – адзін з найбольш устойлівых кампанентаў этнічнай культуры. Гэта тлумачыцца пераважна вясковым ладам жыцця большасці жыхароў Беларусі (аж да апошняга часу), адносна слабой дынамікай мадэрнізацыйных працэсаў і, як паследак, кансервацыяй традыцыйных форм вясковай культуры. Пад традыцыйнай культурай у беларускай навуцы маецца на ўвазе пераважна культура другой паловы XIX – пачатку XX ст. – часу, які найбольш дасканала вывучаны этнографамі і фалькларыстамі. Разам з тым традыцыйная матэрыяльная культура, зразумела, не абмяжоўваецца ў сваім гістарычным існаваннні дадзеным перыядам, які, па сутнасці, быў апошнім у развіцці традыцыйнай культуры, у класічным разуменні гэтага паняцця, але ахоплівае больш храналагічна глыбінныя пласты.

Этнаграфія – гэта гістарычная дысцыпліна, якая вывучае вызначанае кола з'яў традыцыйнай культуры – матэрыяльную (жыллё, адзенне, ежа, сельскагаспадарчую тэхніку, промыслы і рамёствы, транспартныя сродкі), духоўную (звычаі і абрады, быт, магію). Прадметная вобласць этналогіі заходзіць у сферы даследавання фальклору, міфалогіі, а таксама іншых навук – гісторыі, лінгвістыкі, сацыялогіі, дэмаграфіі, антрапалогіі. Акрамя гэтага, этналогія мае больш высокі тэарэтычны ўзровень, бо мае справу пераважна не з вопісамі і класіфікацыяй этнаграфічных з'яў, а з канцэптуальнымі сістэмамі, працэсамі. Этнаграфія вывучае пераважна тыпы матэрыяльнай і духоўнай культуры, іх змены ў прасторы і часе.

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

У цэнтры даследавання этнаграфіі знаходзіцца этнас. Этнасам называецца ўстойлівая супольнасць людзей, якую адрозніваюць тэрыторыя кампактнага (а таксама дысперснага) пражывання, этнічная самасвядомасць, этнанім, гісторыка-культурная анамастыка, спецыфічная мова, этнаспецыфічная і поліэтнічная культура, у тым ліку – бытавая, вызначаная палітычная (патэстарная), эканамітчная сістэмы, своеасаблівыя сацыяльна-дэмаграфічныя паказчыкі, этнапсіхалогія, уяўленні аб агульнасці паходжання, агульных продках, антрапалагічны воблік.

Этнас – паняцце гістарычнае. Пад уплывам гегельянства, эвалюцыянізму склалася ўяўленне аб гістарычнай іерархіі, развіцці этнічных утварэнняў – ад радавой грамады, племені, народнасці – да нацыі. Злучэнне этнасу і дзяржавы з дэмакратычным ладам жыцця і рынкавай эканомікай, што забяспечвае ўсталяванне функцыянавання шырокага спектру кампанентаў этнасу, – з'ява сучаснай, пераважна еўрапейскай, цывілізацыі.

Асноўнай вызначальнай адметнасцю нацыі з'яўляецца спалучэнне этнаса і краіны па прынцыпу адзін (тытульны) этнас і адна дзяржава. Таксама для нацыі ўласцівы адзінства эканамічнага жыцця, мовы і этнічнай самасвядомасці.

Беларусы як індаеўрапейскі этнас з'яўляецца часткай еўрапейскага этнакультурнага, антрапалагічнага кангламерата. Беларусы склаліся на аснове злучэння двух індаеўрапейскіх этнічных утварэнняў – славян і балтаў (асіміляцыі балтаў славянамі) пры сегментарным уздзеянні мангалоідаў на паўночным усходзе (магчыма, фіны былі асіміляваны яшчэ балтамі). Гэта адрознівае беларускі этнас ад суседніх рускага і ўкраінскага, склаўшыхся ў выніку асіміляцыі славянамі адпаведна мангалоідаў (фінаў) на рускіх землях і цюркскіх народаў (сарматаў, хазар, іншых) на ўкраінскіх. Асноўныя этнакультурныя, этнагенетычныя працэсы на беларускіх землях адпавядалі агульнаеўрапейскім і ўсходнееўрапейскім метакультурным працэсам і тэндэнцыям – каланізацыйнай міграцыі індаеўрапейцаў у II тыс. да н. э. (землі Беларусі былі цалкам заняты другой хваляй міграцыі балтаў), а таксама міграцыйнай экспансіі славян у



РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

VI ст. н. э. (Пражская культура). На беларускіх землях рассяліліся плямёны крывічоў, радзімічаў, дрэгавічоў.

Паступова пачалося ўтварэнне вялікіх патэстарных, палітычных супольнасцей, аб'яднаных адносна слабой уладай асобных гарадскіх цэнтраў. Інспіруючым элементам гэтага працэса на ўсходнеславянскіх землях была наяўнасць нарманаў (шведаў, датчан, нарвежцаў), якія з дружынамі цэнтралізавалі ўладу. Так узніклі княствы (называліся таксама "землі"), існаванне якіх грунтавалася на наяўнасці гарадскіх, іншых пасяленняў (умацаваных пасяленняў князёў, рамеснікаў, купцоў, ваенных дружын). Землі крывічоў першапачаткова ўваходзілі ў так званую "Верхнюю Русь" (гэта даследчыцкая назва), буйным цэнтрам якой быў Ноўгарад. Акрамя крывічоў гэтыя землі займалі словені, шматлікія фіна-угорскія, балцкія плямёны.

Нашыя землі з Полацкім (палачанамі), Тураўскім княствамі зрабіліся часткай Русі (так званай Кіеўскай Русі), буйнымі цэнтрамі якой, акрамя Кіева, былі Ноўгарад і Полацк. Паступова на аснове крывічоў пры актыўным удзеле дрэгавічоў, радзмічаў, таксама балтаў – літвы, яцвягаў – пачаліся працэсы інтэграцыі і кансалідацыі ўсходнеславянскіх плямёнаў вакол Полацкага княства. Ішоў фундаментальны для этнагенезу беларусаў працэс асіміляцыі славянамі балцкіх плямёнаў, што працягвалася прыблізна з VI па IX ст. Працэс узаемадзеяння мігрантаў славян і балтаў быў спакойны, зафіксавана толькі некалькі (2–3) спаленых балцкіх гарадзішчаў. Паступова на беларускіх землях пачала дамінаваць культура ўсходніх славян. Потым, недзе з XIII ст. зніклі племянныя назвы, выпрацаваліся агульныя асаблівасці мовы, культуры. З прыняццем хрысціянства на Беларусі з'явіліся этнічныя маркеры хрысціянскага паходжання – базілікальны тып храма, вольная кампазіцыя фрэсак.

Беларускі этнас склаўся прыблізна ў XV ст., аб чым сведчаць наяўнасць старабеларускай літаратурнай, дзелавой мовы, этнічнай самасвядомасці – назваў літва, ліцвіны, русіны, назваў густорыка-культурных рэгіёнаў – Белая Русь, Чорная Русь, Палессе, Падляшша, Літва, агульнай назвы зямель – Літва, асаблівасцей культуры – літаратуры (летапісы), беларускай готыкі (культавых

будынкаў, абарончага дойлідства), выяўленчага мастацтва (беларуская ікона), пластыкі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Пачалі фармавацца этнаграфічныя рэгіёны – Падзвінне, Падняпроўе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь, Заходняе, Усходняе Палессе.

Этнаграфія вывучае матэрыяльную – жыллё, адзенне, ежу, сельскагаспадарчую тэхніку, промыслы і рамёствы, а таксама духоўнаю – звычаі, абрады, замовы, магію – традыцыйную культуру этнасу.

Міфалогія – навука, якая вывучае міфы, а таксама свод міфаў пэўнай краіны. Таксама пад міфалогіяй разумеюць нешта незвычайнае, тое, што не адпавядае рэчаіснасці. Міфалогія вывучае віды міфаў, міфалагічных персанажаў – багоў, нячысцікаў, іншых.

Фальклор – вусная народная творчасць. Яна падзялаецца на празаічную – казкі, лягенды, паданні, былічкі, а таксама паэтычную – каляндарныя, сямейныя, пазаабрадавыя песні, дзіцячы фальклор.

У аснову этнаграфічнага даследавання Беларусі пакладзены працы Я. Карскага, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, ішшых даследчыкаў другой паловы XIX – пачатку XX ст., а таксама работы сучасных этнографаў А. Курыловіч, Л. Ракавай, В. Бялявінай, Г. Каспятовіч, іншых.

## Тэма 2. Традыцыйнае жыллё

Жытло, поруч з прыладамі працы, – найбольш старажытныя з помнікаў матэрыяльнай культуры Беларусі. Першыя парэшткі іх былі знойдзены на верхнепалеалетычных стаянках Бердыж і Юравічы на Усходнім Палессі. Далей, за часам бронзавага і жалезнага вякоў, на Беларусі існавалі розныя тыпы жытла – пераважна балцкія доўгія шматкамерныя простакутныя і, радзей, квадратныя дамы слупавой і змешанай канструкцыі, а таксама невялікія круглыя ці блізкія да квадрату напаўзямляначныя хаты мілаградскай культуры, наземныя слупавыя і зрубныя збудовы (аднакамерныя зрубы) зарубінецкай ды іншых культур Паўднёвай Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

Этнаспецыфічная асаблівасць старажытнага жытла на нашых землях – ягоная пераважна слупавая канструкцыя, г. зн., што сцены хаты складаліся з вертыкальных бярвенняў-слупоў ці паміж імі гарызантальна закладаліся бярвёны сцяны. Гэтая канструкцыйная асаблівасць звязваецца даследчыкамі з балцкім этнасам, які займаў большую частку беларускіх зямель у тыя часы. Славяне, што пачалі масавую каланізацыю Беларусі з другой паловы I тыс. да н. э., прынеслі іншы тып жытла – паўзямлянaчную ці зямлянaчную збудову з глінянаю ці каменнаю печкаю ў куце, дзе больш значнае месца займалі зрубныя канструкцыі, хаця слупы па кутах і заставаліся.

З часоў славянскай каланізацыі на нашых землях паступова распаўсюдзіўся вядомы з раскопак тып старабеларускай вясковай пабудовы — невялікі зруб з каменнямі пад ніжнімі вянцамі, з пераважна землянымі або глінабітнымі ці, радзей, зробленымі з дошак падлогамі, а таксама, як можна меркаваць, з двухскатнымі стрэхамі, глінабітнымі печкамі на драўляных каркасах ці на гліняна-каменнай аснове. Паступова жытло зрабілася цалкам наземным, хаця існавалі і зямлянaчныя і паўзямлянaчныя хаты (хутчэй, як праява славянскай этнічнай спецыфікі), якія з часам саступілі месца больш функцыянальна дасканаламу жытлу.

На Беларусі склаўся пэўны характэрны комплекс сельскіх паселішчаў. Асноўныя назвы іх – вёска, сяло, слабада, ваколіца, засценак, мястэчка. Вёска (слова ўзнікла ад старажытнаславянскага “весь”) – асноўны тып вясковага паселішча – гэтак называлася, незалежна ад памераў, кампактнае пасяленне сялян. Зазвычай вёска не мела вялікіх сакральных, адміністрацыйных пабудоў; акрамя сялянскіх сядзіб, у ёй магла размяшчацца, хіба, карчма. Сяло да пачатку XIX ст. было досыць пашыранай назвай сельскага паселішча. Ад вёскі яно адрознівалася больш буйнымі памерамі, а таксама наяўнасцю адміністрацыйных установ, храмаў, адносна буйных кірмашоў. Пасля правядзення ў XVI ст. валочнай рэформы колькасць селішчаў з назвай сяло (хаця там магло не быць адміністрацыйна-культавых установ) значна павялічылася – рэформа была зарыентавана на ўтварэнне вялікіх планава дасканалых вулічных пасяленняў. У XVIII ст., у

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

сувязі з неабходнасцю засялення новых зямель пасля спусташальных войнаў XVII і пачатаку XVIII стст., колькасць новазаснаваных селішчаў з такой назвай рэзка вырасла. Разам з тым, пасля далучэння да Расеі сёлы паступова страчвалі свае старажытныя тыпалагічныя прыкметы, і на нашых землях пачала дамінаваць назва вёска. Слабодамі называліся пасяленні, жыхары якіх у XVII–XVIII стст. вызваляліся на пэўны час ад выплаты падаткаў, мелі льготы ў выкананні павіннасцяў з прычыны дрэннай якасці глебы (адсюль, магчыма, этымалогія слова слабада – паслабленні). Пазней слабодамі сталі называцца пасяленні рамеснікаў каля гарадоў, якія адсланіліся ад сельскай гаспадаркі, але не зрабіліся гараджанамі.

Характэранай асаблівацю беларускіх сельскіх паселішчаў з'яўляюцца ваколіцы – невялікія пасяленні дробнай шляхты, зазвычай агароджаныя плотам (там маглі жыць і зямяне, баяры – пераходныя групы паміж шляхтай і сялянамі). Тыпалагічна да ваколіцы быў падобен засценак – пасяленне, узніклае ў выніку “Уставы на валокі” за межамі (“сценамі”) зямлі, адмыслова падзеленай між сялян. Такія дзялкі зазвычай аддаваліся ў арэнду дробнай шляхце. Ваколіцы і засценкі з цягам часу пераўтварыліся ў вёскі ці зніклі. Памежнае становішча ад гораду да вёскі займала мястэчка адносна буйное селішча, вядомае на нашых землях з XV ст. Заснаванае па каралеўскім прывілеі (ці самазвана), мястэчка абавязкова наладжвала таргі, а таксама кірмашы. Пачасту яно мела й адміністрацыйныя ды культавыя ўстановы, сядзібу феадала. Насельніцтва мястэчка складалі гандляры, рамеснікі, сяляне.

Што да памераў паселішчаў, то ім былі ўласцівы рэгіянальныя адрозненні. Там, дзе была праведзена валочная рэформа, – г. зн. у заходніх і цэнтральных частках беларускіх зямель, вёскі вызначаліся адносна буйнымі памерамі – параўнальна з вёскамі паўночнага ўсходу, дзе рэформа цалкам не была праведзена.

Планіроўка сядзібы таксама мела істотныя рэгіянальныя адрозненні, звязаныя з папярэднімі асаблівасцямі. Увогуле на Беларусі вылучаюцца наступныя тыпы планіровак: пагон – калі ўсе будынкі ставяцца ў адзін рад (пагон бывае


РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

аднарадны, двухрадны, трохрадны), вяночны (двор утварае замкнёны абшар), Г-падобны, свабодны, з нязвязанымі пабудовамі. У Цэнтральнай Беларусі, Панямонні, Палессі – там, дзе была праведзена валочная рэформа, – бытаваў пагон, які й рэкамендаваўся палажэннем рэформы, калі сядзіба мусіла размяшчацца побач з замацаванай валочнай зямлёй. Даўжэзныя пагоны, што мясціліся ў шэраг адзін за адным уздоўж наўпростай доўгай вуліцы, складалі асаблівасць традыцыйнай сельскай забудовы адзначаных беларускіх рэгіёнаў. Двухрадны пагон, калі будынкі сядзібы ішлі двума паралельнымі радамі, быў у большай ступені распаўсюджаны ў паўночна-ўсходніх раёнах Беларусі. На паўночным усходзе панаваў вяночны тып забудовы, адзначаны даследчыкамі ў канцы XVIII ст. у Полацкім намесніцтве і Крычаўскім графстве.

Тыповы набор гаспадарчых пабудоў таксама вылучаўся рэгіянальнымі і этнаспецыфічнымі характарыстыкамі. У яго ўваходзілі хата, да якой прымыкалі камора ці варыўня, клець (на захадзе называлася свіран), хлявы (хлеў для коней – стайня), павець, адрына ці пуня — збудова для захавання сена, пограб (склеп), гумно з сушылкай (ёўняй, асеццю) ці без яе, лазня, калодзеж (студня); двор быў абгароджаны плотам, замётам. У XVII–XVIII стст. меліся і спецыяльныя ямы-сховішчы, у якіх наводдаль ад вёскі, у глухіх месцах, хавалі ежу і прадметы хатняга ўжытку – асабліва падчас ваенных дзеянняў.

Цэнтральнае месца у сядзібе займала хата (ізба, дом – добрая хата, халупа – дрэнная). Найбольш старадаўняя хата – аднакамерны будынак, да якога потым дадалі сенцы — так утварыўся двухкамерны будынак. Далейшая эвалюцыя хаты адбывалася праз ускладненне планіроўкі. Хутчэй за ўсё, першым трохкамерным будынкам быў у старажытнасці гэткі, што меў планіроўку хата+сенцы+клець. Потым, за выключэннем рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі, клець адасобілася, а хата зрабілася двухкамернай: хата+сенцы — прычым у пэўных рэгіёнах у сенцах маглі спаць.

Далейшая эвалюцыя планіроўкі жытла звязана з пераходам да трохкамернай планіроўкі хата+сенцы+камора. Саму хату будавалі выключна з дрэва (цвікі таксама былі драўлянымі) – яліны, хвоі. На ніжнія вянцы выкарыстоўвалі

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

дуб. Пад вуглы, а таксама, радзей, пад сярэдзіну будынку падкладалі дубовыя “штандары”, прастора між якімі запаўнялася не надта тоўстымі бярвеннямі ці гарбылямі, а таксама вертыкальнымі чурбакамі. Замест штандараў маглі выкарыстоўваць камяні-валуны, паміж якіх насыпалася дробнае каменне; іншым разам хату ставілі непасрэдна на зямлю.

Канструкцыйныя асаблівасці хаты маюць як поліэтнічныя, так і этнаспецыфічныя рысы. Да першых адносіцца зрубны характар будоўлі, уласцівы таксама суседзям – рускім, украінцам, літоўцам, палякам.

Характэрныя планіровачныя асаблівасці беларускага жытла: замкнёны двор, аднарадная, лінейная забудова набліжае яго да польскага, чэскага, славацкага. Тое ж тычыцца канструкцыйных асаблівасцяў: шырокае ўжыванне зрубнай і слупавой канструкцый для збудавання сцен, умацаванне столі на адной бэльцы, адсутнасць суцэльнага падмурку, інш. Поліэтнічны характар таксама мае звычай падкладання каменя пад падмурак (тое ж у Літве, Латвіі, на Пскоўшчыне).

Што да этнаспецыфічных рыс, дык трэба адзначыць вонкавае адрозненне беларускай хаты ад пабеленай украінскай, а таксама рускай, якая досыць часта размяшчалася на падклецці. Вялікія пагонныя двары таксама характэрна вылучаюць беларускае традыцыйнае жытло ад украінскага і рускага. Такія тыповыя рысы, як колькасць і размяшчэнне вокан (тут назіраюцца аналогіі з украінцамі), наяўнасць прызбы утвараюць характарыстычныя элементы беларускага жытла.

Адметнымі рысамі вызначаўся і інтэр'ер хаты. Як пазначалася вышэй, да другой паловы XIX ст. яна была пераважна курнай, і працэс усталявання комінаў ішоў досыць марудна. Як сведчыў у канцы 20-х гг. XIX ст. К. Кантрым, у хатах без коміну ў той час на Палессі жыла нават дробная шляхта. Адтуліна для дыму рабілася над дзвярыма, дым выходзіў таксама праз адтуліну ў столі пасярэдзіне хаты, што закрывалася зверху, і зразумела – праз вокны.

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

## Тэма 3. Традыцыйная адзенне

Традыцыйнае беларускае адзенне, асабліва жаночы строй, багатае этнакультурным зместам. Адзенне, якое сумяшчае утылітарны, мастацкі, знакавасімвалічны элементы, у найбольшай ступені, параўнальна з іншымі відамі матэрыяльнай культуры, сінтэзуе розныя бакі культуры этнасу.

Традыцыйнае адзенне амаль цалкам саматужна выраблялася з сваёй сыравіны і, пераважна, – жанчынамі. Адзенне рабілася з ільну, валокан канапель, жывёльнай скуры, воўны. Шлях да гатовага вырабу быў досыць працяглы і ўлучаў шэраг паслядоўных аперацый. Так, сцябліны льну ці канаплі спачатку мачылі, потым мялі на спецыяльнай мялцы, трапалі, часалі грэбнямі і шчоткамі, а толькі потым сталі прасці — на адмысловай дошцы ці на калаўроце з колам. Пражу намотвалі на матавіла, сушылі, пачасту – бялілі, снавалі і нарэшце пачыналі ткаць.

Фарбавалі самі. Варта адзначыць, што да з’яўлення фабрычных тэхналогій у летнім адзенні беларусаў пераважалі натуральныя белыя колеры; тое ж тычылася і зімовай вопраткі. Воўнавую тканіну на андаракі, нагавіцы, камізэлькі традыцыйна фарбавалі. Да рамеснікаў звярталіся, калі трэба было вырабляць верхняе адзенне, якасныя віды абутку, пэўнае формы галаўныя уборы.

Традыцыйная апранка падзяляецца на мужчынскую і жаночую (праблемным падаецца дзіцячы камплект), сезонную, будзённую і святочную (тут можна вылучыць абрадавае адзенне – напрыклад, маладое, свахі, свата). Дарослы чалец сям'і меў некалькі камплектаў вопраткі: святочную, а таксама будзённую для кожнай пары году. Гэта тычылася і такіх складаных для вырабу рэчаў, як кажух і світка, якія таксама прызначаліся для працы і свят.

Найбольш ярка характарыстычныя рысы традыцыйнага беларускага адзення праявіліся ў жаночым строі. Аснову традыцыйнага адзення склала апранка нацельная, сподняя, найперш – і ў жанчын, і ў мужчын – кашуля. У жанчын летні строй дапаўняўся спадніцай, хвартухом, кароткай камізэлькай (ці апранкай з рукавамі), галаўным уборам і абуткам. Гэты комплекс мае поліэтнічны, усходнеславянскі характар; этнічныя ягоныя асаблівасці вызна-

чаюцца, перадусім, кроем. Адзін з найбольш істотных элементаў традыцыйнага строю – кашуля (сарочка, рубаха). Найбольш старажытным відам крою лічыцца тунікападобны – калі палатно складалі напалам, пасярэдзіне рабілі выраз для галавы, паніжаючы яго спераду бліжэй да грудзей, і пакідалі адтуліны для рук.

Асноўная паясная вопратка жаночага строю – спадніца. Яна шылася з даматканага палатна, сукна ці паўсукна. Спадніца рабілася з некалькіх (да шасці) полак (падоўжаных кавалкаў палатна), сшытых і прызбораных ля поясу. Зрэдку спадніцу шылі з папярэчнага кавалку тканіны – папярэчкі. Спадніца завязвалася спераду ці крыху збоку тасёмкамі ці паяском. Вылучаюцца спадніцы, якія шыліся з ваўнянай ці паўваўнянай тканіны – андаракі (слова паходзіць з нямецкай мовы). У старажытнасці андаракі ў якасці верхняй спадніцы насілі прадстаўніцы паноўных класаў. Андарак багата ўпрыгожвалі, і асаблівасцю ягонай ёсць клеткавы арнамент.

Да старажытнага віду паяснога адзення належыць панёва – нясшытая ці, радзей, сшытая спадніца кшталту андараку. Магчыма, на нашых землях расхінная панёва папярэднічала андараку. Паверх спадніцы зазвычай павязваўся хвартух (пярэднік), які прымацоўваўся на стане паўразамі. Рабілі яго з адной, дзвюх, зрэдку – трох полак, і даўжыня ягоная ў беларусак амаль супадала з даўжынёю спадніц.

Яшчэ адзін від адзення, уласцівы беларусам, а таксама заходнім суседзям, – безрукаўка. Гэта было досыць каштоўнае адзенне і, зыходна з пазнейшых этнаграфічных дадзеных, магло перадавацца ў спадчыну. На Беларусі яно мела назву “кабат”, “шнуроўка”, “гарсэт”, “безрукаўка”, інш. Безрукаўкі часцей шылі з пакупнога сукна яркай расфарбоўкі. Найбольш просты і, магчыма, старажытны іх крой – з простай спінкай, калі задняя частка рабілася з суцэльнага кавалку матэрыялу.

Верхняе адзенне вясковай жанчыны не надта каб вылучалася своеасаблівасцю: як і ў мужчын, гэта былі сярмяга і кажух, якія ўзгадваюцца ў актах XVII–XVIII стст. і якія рабіліся з хатніх матэрыялаў – сукна, палатна, аўчыны, адмыслова апрацаваных і пашытых краўцамі. Гэтая вопратка не мела падкладкі,

РЕПОЗИТОРИЙ МГЭУ

магла зашпіляцца на драўляныя гузікі, гаплікі, альбо проста падпаясвацца. Найбольш пашыраным відам адзення была світа (сярмяга) – зробленаяе зазвычай з сукна доўгае расхінастае адзенне з рукавамі, разрэзам спераду і адкладным каўняром.

Іншае верхняе адзенне – кажух, прыкладам, – рабілася ў старажытнасці з нядубленых белых аўчын. Найбольш пашыраны быў на Беларусі кажух простага крою, мадыфікацыі яго адпавядалі крою світкі; адрозна ад пазнейшых часоў, старажытны кажух быў даўгім. Менш распаўсюджана было верхняе палатнянае адзенне – насоў, балахон, якое апраналі на кашулю ўлетку ці ўвосень.

Істотнае месца ў традыцыйным строі займалі галаўныя ўборы. Яны таксама падзяляліся на сезонныя, святочныя і будзённыя і адрозніваліся залежна ад полу, сямейнага становішча ды ўзросту. Тыпалагічна вызначальным для ўбору было сямейнае становішча: на непакрытых валасах, косах — вянок (на цвёрдай драўлянай аснове, абшытай палатном; улетку — кветкавы), а таксама галаўная павязка, зазвычай завязаная вузлом на патыліцы, былі адзнакамі дзяўчыны. На святы ў косы ўплялі болей рознакаляровых істужак, а вянкі лепей аздаблялі.

Адзін з найбольш старажытных жаночых галаўных убораў беларусак, а таксама ўкраінак, прыбалтак – намітка: ручніковы галаўны ўбор з тонкага палатна значнай даўжыні (2–3 м), што павязваўся на чапец (яшчэ таксама – на цвёрдую аснову) так, каб адзін альбо абодва ягоныя даўгія канцы спускаліся на спіну.

Акрамя намітак, беларускія жанчыны насілі ў старажытнасці чапцы – згаданыя вышэй з круглым верхам, аколышкам і завязкамі ззаду, і глыбокія, з завязкай пад падбародак (“каптур”). Існавалі і арыгінальныя, рагатыя, галаўныя ўборы, зробленыя на цвёрдай аснове і абвязаныя палатном (старажытны тып – “пушанка”).

Падобным да мужчынскага быў і жаночы абутак. Асноўным відам яго былі плецёныя з лыка ліпы, лазы, бяросты, пянькі ці скураныя лапці. Існуе меркаванне, што найбольш старажытнымі былі лапці простага пляцення. Лапці абуваліся на анучы – летнія ці зімовыя, мацаваліся вяроўкамі-аборамі. Найбольш просты тып лапцей – без галовак і запятак, дзе іх замянялі лыкавыя петлі



РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

і прыстасаванні для мацавання абораў. Вядомы і скураныя лапці (пасталы), але шырокага распаўсюду яны не набылі. Акрамя лапцей, насілі скураныя паўбоцікі на абцасах (чаравікі), але гэта быў дарагі абутак. Таксама заможныя сяляне маглі здабыць валёнкі. Як досыць рэдкі від абутку можна вылучыць драўляны – цалкам з дрэва ці са скураным верхам.

Традыцыйнае мужчынскае адзенне беларусаў вызначалася меншай разнастайнасцю, чым жаночае. Параўнальна з жаночай, мужчынскія кашулі ўпрыгожваліся сціпла.

Мужчынскія порткі (нагавіцы, ганавіцы) рабіліся з палатна (на лета), сукна (каб насіць узімку) не надта добрага гатунку. Беларускія нагавіцы былі параўнальна не шырокімі, іх адрознівала рамбавідная форма ўстаўкі паміж штанінамі, хаця мелі месца і ўстаўкі іншай формы – трохвугольнай, круглай, трапецыявіднай, і трымаліся на шнурку, прасоўваным праз абшыўку ў верхняй частцы. Суконныя нагавіцы маглі зашпілянца на адзін ці два гузікі з косці, скуры, кавалачка дрэва і не мелі кішэняў.

Абавязковай прыналежнасцю мужчынскага строю быў пояс – старажытны плецены ці тканы. На поясе вісела невялічкая торбачка – каліта, у якой захоўваліся грошы, тытунь, люлька, крэсіва, нож (мог вісець і асобна). Сяляне таксама насілі скураныя рамяні, якімі падпаясвалі світкі (здаўна згадваюцца ў актах XVI–XVII стст.). Беларускія мужчыны насілі безрукаўкі (камізэлькі, жупіцы).

Мужчынскія світа і кажух па сваіх відавых асаблівасцях мала адрозніваліся ад жаночых. Гэтага нельга сказаць пра галаўныя уборы – з воўны, футра, сукна, саломы. Традыцыйны летні галаўны ўбор – плецены з саломы (радзей – з лазы, чароту) шырокапольны капялюш з тулляй (брыль). Са старажытных актаў вядомы магеркі — валяныя шапкі з палямі, што прылягалі да туллі, а таксама валяныя брылі ды інш. Старадаўнія зімовыя шапкі шыліся з футра ваверкі, лісы, зайца, а таксама з аўчыны футрам навонкі. Найбольш старажытныя, з аўчыны, былі высокімі, цыліндрычнай, конусападобнай формы – кучмы. Зімовая шапка падкрэслена вялікіх памераў называлася капузай. Скары-



РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

стоўвалася і футравая шапка, абшытая зверху сукном, з вушамі – малахай. Досыць старадаўняю ёсць пашытая, зазвычай – з аўчыны, аблавуха – шапка з вушамі па баках спераду і ззаду (яны падвязваліся зверху).

Мужчынскі абутак складалі лапці (такія ж, як і ў жанчын), боты (рэдкі, пераважна мужчынскі абутак), валёнкі.

### Тэма 4. Сельскагаспадарчая тэхніка. Промыслы і рамёствы

Значнае месца ў жыцці вяскоўца займала земляробства. Земляробчы сезон доўжыўся на Беларусі прыблізна з сярэдзіны красавіка да сярэдзіны кастрычніка і ахопліваў крыху больш за палову каляндарнага году. Гэта быў перыяд надзвычай актыўнай працы.

Для вясковай культуры характэрная замкнёная нерухомасць асноўных тэхналагічных прынцыпаў і прыёмаў. Галоўны імпульс да змен у гэтай сферы прыходзіў зазвычай звонку і быў звязаны з прамысловым удасканаленнем метадаў і прылад працы. Такі ўплыў на беларускую сельскую гаспадарку пачаў назірацца з другой паловы XIX ст., дзелячы, такім чынам, традыцыйную сельскагаспадарчую тэхніку беларусаў апошніх стагоддзяў на два этапы: позняга феадалізму і ранняга капіталізму.

Земляробства, поруч з жывёлагадоўляй, – асноўныя заняткі насельнікаў Беларусі ад бронзавага веку. Традыцыйна на Беларусі вырошчвалі жыта, пшаніцу, авёс, ячмень, грэчку (з'явілася дастаткова позна), проса, чачавіцу, канаплю. На гародах садзілі рэпу, буракі, моркву, капусту, цыбулю, часнык, а таксама садовыя дрэвы – яблыкі, ігрушы, слівы, вішні, ягады – ды кустарнікі – парэчку, агрэст, інш. Ад канца XVIII ст. пачала шырока распаўсюджвацца бульба, якая з другой паловы XIX ст. заняла істотнае месца ў рацыёне сялян, фактычна замяняючы хлеб.

Сярод тэхнічных культур добрую долю займалі лён, канапля. Здаўна на нашых землях склалася некалькі сістэм земляробства, сярод якіх найбольш старажытнай была падсечная (лядная), што дажыла да XIX ст. У XVII—XVIII стст. выкарыстоўвалася трохполле, а таксама двухполле. Ведалі продкі і старажытны

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

пералог, калі частка зямлі не апрацоўвалася, пакуль не адновіць сваёй кандыцыі. Прыкметную ролю ў распаўсюджанні трохполля і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ўвогуле адыграла валочная рэформа 1557 г.

Сельскагаспадарчыя прылады беларусаў вылучаліся функцыянальным і відавым кансерватызмам. Галоўная прылада земляробства – саха, якая, за выключэннем жалезных сашнікоў, была хатняй вырабкі. Старажытная саха рабілася з выкапанага з коранем камля дрэва – рагач, да якога далучалася рабочая частка – расоха, плаха, што прымацоўвалася да рагача пад вуглом і мела падвоены канец, на які й надзяваліся жалезныя сашнікі (нарогі). Да двух канцоў расохі мацаваліся нерухомыя паліцы – дошкі розных памераў, якія рэгулявалі пераварот ворыўнага пласта. Такая саха была прыстасавана для двух валоў і атрымала назву літоўскай, палескай, ці падляскай. Саха гэткага кшталту была распаўсюджана, акрамя Беларусі, на суседніх польскіх, украінскіх, літоўскіх землях. На паўночных землях Беларусі пазней атрымалі распаўсюджанне сохі на конскай цязе – віцебскага тыпу, з перакладной (рухомай) паліцай для аднаконнай цягі, а таксама іншыя мадыфікацыі.

Для апрацоўкі дзярновай зямлі, лугу выкарыстоўваўся разак – прылада з вострым наканечнікам ці даўгім нажом на канцы. Для акучвання бульбы мелася сошка – невялікая саха з аднім лемехам.

Пасля апрацоўкі зямлі сахой рыхленне яе ажыццяўлялася бараной. Найбольш старажытныя віды барон – зробленая з верхавіны яліны сукаватка, а таксама смык са звязаных яловых плашак. Досыць пашырана была пляцёная барана на дугападобнай аснове.

Акрамя цяглавых, скарыстоўваліся ручныя прылады апрацоўкі глебы, сярод якіх досыць папулярнымі былі матыкі (цяпкі, сапкі), і найбольш старажытныя з іх рабіліся цалкам з дрэва. Драўлянымі даўней былі таксама лапаты (рыдлёўкі), крукі і вілы для гною.

Збожжа збіралі сярпамі, грачыху, авёс, гарох маглі касіць косамі, імі ж скошвалі і траву. Самыя старажытныя косы без ручкі, з кароткім кассём.

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

Зжатае збожжа звязвалі ў снапы і састаўлялі ў бабкі. Снапы сушылі ці на азяродах (Віцебшчына, Міншчына) – драўляных слупах з перакладзінамі, ці ў асецях (ёўнях) – сушыльнях на гумнах. Снапы звозілі ў гумно – вялікае памяшканне з токам, дзе збожжа малацілі цапамі, пранікамі, веялі лапаткамі-веялкамі ці праз сіта. Дзеля працы са снапамі, саломай выкарыстоўвалі драўляныя граблі, вілы. Потым зерне складалі ў клеці, адмысловыя ямы, дзе яно чакала перапрацоўкі на муку і крупу. Гэтак рабілася на ветраных і вадзяных млынах, але часта вяскоўцы таўклі для атрымання крупы зерне ў драўляных ручных (ці, зрэдку, – нажных) ступах таўкачамі. Муку малолі на хатніх жорнах, камяні якіх абапіраліся на чатырохвугольную аснову.

Вялікае месца ў гаспадарчай дзейнасці беларусаў займала жывёлагадоўля. Кожная гаспадарка трымала працоўную жывёлу, прычым, на паўднёвым захадзе ў XVII–XVIII стст. пераважалі валы, на іншых землях – коні. У першай палове XIX ст. буйной рагатай жывёлы мелася у сярэднім 3–4 галавы ў двары. Апрача гэтага, абавязкова гадавалі авец, свіней, радзей – коз, хатнюю птушку: гусей, кур, качак.

У мясцінах бліз рэк, азёр сяляне займаліся рыбальствам. Сярод прылад для лоўлі рыбы традыцыйнымі былі аднасценныя ці трохсценныя сеткі, невад (вялікі і малы), брэдзень – невад для лоўлі рыбы ўброд, крыгі. Шырока скарыстоўваліся і стаўныя лавушкі: паплаў, буч, кацец, нерат, венцер, каробка, скрыпка, ват, а таксама лавушкі рухомыя – таптуха, кломля, хапун, волак, брадан, настаўка. Выкарыстоўваліся вуды, перамёт, старажня. Працягвалі ўжываць дзеля гэтых мэт і астрогу (восці).

Яшчэ адным промыслам сталася бортніцтва – у старажытным выглядзе як развядзенне, утрыманне пчол у борцях – выдзеўбаных у дрэвах дуплах. Далейшае развіццё бортніцтва – калодачная форма, калі вулей рабіўся ў пастаўленай альбо пакладзенай калодзе. Мелі пашыранасць таксама саламяныя вуллі.

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

## Тэма 5. Традыцыйная кухня

Старажытная беларуская традыцыйная кухня ўмоўна падзяляецца на тую, што была да шырокага распаўсюджвання бульбы, і кухню пасля гэтай падзеі. Актыўнае спажыванне бульбы супала з пэўнай мадэрнізацыяй кухні пад уплывам новых гістарычных умоў XIX ст.

Традыцыйная кухня, у адрозненні ад шляхецкай, вызначалася вуглеводным характерам атрымання калорый. Мяса актыўна спажывалі тады, калі забівалі свіней, – восенню, а таксама зімой, да Вялікага паста. Асноўныя стравы былі з зерня, вялікая роля належыла кашам і хлебу. Недахоп бялкоў жывёльнага паходжання замяшчаўся грыбамі, бабовымі культурамі, курынымі яйкамі. Найбольш галоднымі часамі была вясна і пачатак лета, калі ў хлеб маглі дабаўляць кару, дзікую зелень. Беларусы саблюдалі пасты, у час якіх елі шмат бліноў, кашы, рыбу, мучныя вырабы.

Найбольш старажытная кухня мала адлюстравана ў крыніцах. Як можна меркаваць, спажывалася шмат каш – ячневая, пярловая, прасяная, пазней – грэчнёвая. Істотная месца займаў хлеб – будзёны, жытні, і святочны – пячэнні, пірагі, а таксама рытуальны каравай. Рабілі бліны, пераважна вялікія са змешанай жытняй і пшанічнай мукі. На першае елі супы, асноўнае блюда ўключала мяса, сала, яечню. Пілі квас, са спіртовых напояў ужывалі хмельны мёд, гарэлку, піва.

Кухня XIX – пачатка XX ст. вядомая досыць добра. Прадуктамі яе былі зернавыя культуры – жыта, ячмень, грэчка, просы, чачавіца. Садавіна і гародніна прадстаўлена буракамі, рэпай, капустай, гарбузамі, агуркамі. У гародчыках раслі яблыкі, грушы, слівы, ягады – агрэст, чорная смародзіна, парэчка. Прысмакамі былі кроп, часнык, цыбуля. Ужывалі бабовыя культуры – бабы, фасоль, гарох. Малочныя прадукты былі прадстаўлены "салодкім", кіслым малаком, вяршкамі, маслам, клінковым сырам. Адносна слаба былі распаўсюджаны цвёрдыя сыры.

У XVII ст. на нашых землях ад немцаў, галандцаў з'явілася бульба. Яе радзіма – Паўднёвая і Цэнтральная Амерыка, адкуль яе прывезлі іспанскія, пар-

тугальскія каланізатары. Сяляне неахвотна прынялі гэта прадукт, як і шляхта, якая лічыла, што бульба нябыта аслабляе моц. Таму ў шляцецкай прамысловасці з бульбы рабілі крухмал, спірт, бульбяную муку (падобна да таго, як гэта рабілі інкі). Пясчаная глеба спрыяла культаванню бульбы, якая мела тут звыш 20 сартоў. Сярод бульбяных страў можна адзначыць дранікі, калдуны, бабку, камы, якія кідалі ў суп. Дэлікатэсам лічылася смажаная ў кастры бульба. Досыць часта бульбу варылі, аднак, у адрозненні ад Расіі, як асобнае блюда яе не ўжывалі.

У беларускай кухне шырока прадстаўлены разнастайныя грыбы, кожны від якіх апрацоўваўся па-сваему. Валнянкі, апенькі, зелянухі – марынавалі, салілі, баравікі, падасінавікі – сушылі, лісічкі смажылі. Грыбы рэдка смажылі, у асноўным варылі ў супе, кансервавалі. Шырока ўжывалі рыбу, але рыбная кухня ў беларусаў не склалася, што адчуваецца і зараз. Аснову мясной кухні стварала мяса жывёл – перш-наперш свінінай. Мяса крышылі і клалі ў стравы, асабліва шырока ўжывалася салёнае сала, шматок якога, разам з кавалкам хлеба і цыбуляй, заўсёды суправаджаў селяніна ў дарозе. Таксама спажывалася бараніна, радзей – ялавічына. Беларусы елі шмат птушкі – індыкоў, гусей, вутак. Таксама спажывалі шмат яек, якія смажылі са шкваркай, пілі сырымі, радзей варылі.

Існаваў рытуал прыняцця ежы, рэй вёў гаспадар, гаспадыня падавала ежу. Часта елі з адной місы, кожны сваёй лыжкай, па чарзе і старшынству. Зусім малыя дзеці маглі есці седзячы на падлозе. Пад час ежы была асаблівая, урачыстая атмасфера, цішыня. Аб’едкаў не пакідалі, прадукты, асабліва хлеб, нельга было раняць.

Першыя блюда складалі супы, у якія часта дабаўлялася мука. Супы былі досыць разнастайныя – бульбяныя, крупнік, грыбныя, малочны, рыбныя, Асабна можна вылучыць папулярны боршч халодны, таксама старажытны “боршч літоўскі” што ўзгадваўся з XVIII ст. З квашанай капусту рабілі “капусту”, таксама быў распаўсюджаны суп са шчавеля. Асобна можна вылучыць бігус, які рабіўся з квашанай капусты, кавалкаў каўбасы, прысмакаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

Блюда на аснове мяса спажываліся на выходныя, свята. Папулярнымі святочнымі блюдамі былі верашчака і мачанка, у якую макалі бліны. Іх аснову складалі тушоныя свіныя рёбра, кавалкі мяса з мукой. На свята, калі забівалі кабанчыка цм іншую жывёлу, рабілі пячыста – смажаны, тушоны адносна вялікі кавалак мяса. Сярод іншых мясных страў адзначым каўбасы, – падвяндлёную, кравянку. З храшчоў рабілі халадзец, сальцісон. На святы рабілі птушку, радзей парася, якіх маглі начыняць грэчкай. Дэлікатэсам лічылася вендляніна. Асноўнай будзёнай стравай была яечня са шкваркамі, пакладзеная на вараную бульбу. Традыцыйна ўжываліся кашы з салам ці малаком.

З салодкага елі ягады (чарніку, земляніку) з малаком, цёртыя зёрна канаплі з мёдам, мёд, які замяняў цукар. Пілі (елі, як прынята было казаць) кіслае малако, бо салодкае давалі дзецям і цяжарным жанчынам, квас, бярозавы і кляновы сок (кляновік), узвары. З алкагольныя напояў, якія дазвалялася рабіць на святы ці можна было набыць у карчме, ужывалі гарэлку (з жыта, аднаго перагона), піва, медавуху, збіцень.

## Тэма 6. Народны каляндар

Беларусы мелі ўстойлівыя цыклы каляндарных абрадаў, якія можна падзяліць на вясенні, летні, восеньскі і зімні. Старажытны каляндар грунтаваўся на зменах часоў года, сельскагаспадарчым і жывёлагадоўчым цыклах, фазах сонца (сонцастаянне, сонцаварот), месяца (Вялікдзень). Старажытныя календары, у тым ліку біблейскі, грунтаваліся на фазах месяца. Старажытныя егіпцяне адны з першых перайшлі да сонечнага календара і 365 дзен. У Еуропе гэту традыцыю паўтаралі старажытныя рымляне. Язычніцкі календар меў у значнай ступені змляробчы характар, таксама быў звязаны з жывёлагадоўляй. З узнікненнем хрысціянства рэлігійныя святы гэтай рэлігіі размяшчаліся пераважна на датах паганскага календара і атрымлівалі хрясціянскія назвы. У XIX ст., калі былі сабраныя асноўныя этнаграфічныя матэрыялы, святы каляндара адлічваліся па хрысціянскім святам і дням святых. Разам з тым, абрадавы змест святаў заставаўся паганскім, звязаным у першаю чаргу са стымуляваннем плод-

насці. Беларускае сялянства было шматканфесійным, таму святы адзначаліся па-новаму (каталікі, пратэстанты, уніяты) і старому (праваслаўныя) стылям (у дадзенай рабоце даты свят даюцца па новым стылю). Святы гэтых вернікаў маглі адрозніваціца ў назвах, асобных абрадавых элементах, але ў цэлым ішлі па адзінаму рэю. Святы падзяляліся на ўласна святы, калі не працавалі, і прысвяткі, калі праца не прыпынялася. Адзначым, што ў беларусаў назвы месяцаў аўтэнтычныя, не звязаныя з рымскай традыцыяй, як ў шматлікіх еўрапейскіх народаў. Значнае масца ў календары займалі пасты (вылучаўся вялікі пост перад Вялікднём).

Пачатак новага году (гэтага паняцця традыцыйная культура не ведала) прымяркоўваўся да вясны, пачатку Каляд, Купалля. Падаецца, што пачатак навагодняга цыклу, як і ў іншых старажытных народаў, связываўся часцей з вясной.

### Тэма 7. Традыцыйная каляндарная абраднасць

Веснавы цыкл часткова захопліваў Масленіцу – свята развітання з зімой, якая доўжылася Маслены, Сырны, Развітальны тыдзень перад пастом (мяса ўжо не ўжывалі) і святкавалася пераважна ў паўночна-усходніх раёнах Беларусі. Свята (на яго не працавалі) было шумным, радасным – каталіся на санях, канях, хадзілі ў госці, спявалі, гулялі ў “Жаніцьбу Цярэшкі”, “вешалі калодку”.

У апошні дзень маслянага тыдня, нядзелю, выконваўся абрад гукання вясны; дзяўчыны спявалі вяснянкі з характэрным выклічнікам “Гу!” (гукалі вясну) з высокіх месцаў (узгоркаў, стрэх), ішоў своеасаблівы перагалос выканаўцаў, што давала выразны эфект. Таксама для святкавання ішлі ў лес, дзе рабілі вянкі, вадзілі карагоды, частаваліся. У рытуалах выкарыстоўваліся магічныя рэчы – каравай, вянок.

Вяснавыя святы былі стацыянарныя і рухомыя. Рухомаму святу Вялікадня папярэднічаў Вербны (Страсны) тыдзень, прысвечаны ўспамінам пра апошнія падзеі з зямнога жыцця, ўваскрасенне Хрыста. Тут вылучаліся Вербная нядзеля, Чысты панядзелак, Чысты аўторак (чысцілі хаты), Чысты чацвер



РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

(мыліся ў лазні), Вялікодная пятніца (пасціліся, вялі сябе стрымана), Вялікая субота (рабілі пірагі, фарбавалі яйкі, палілі кастры). На Вялікдзень выконвалі валачобны абрад, хадзілі ў госці, білі і качалі пафарбаваныя вялікодныя яйкі, ладзілі гульні. Чацьвер на Вялікодным тыдні (з панядзелка пасля Вялікадня) называўся Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень і быў прысвечаны памяці, ушанаванню нябожчыкаў, якое праходзіла на могілках. Пасля Вялікоднага тыдня пачынаўся Праводны тыдзень, развітываліся з Вялікаднем. Другі аўторак пасля Вялікадня быў прысвечан радаўніцкім Дзядам, якія ладзіліся на могілках і ўяўлялі сабой рытуал сумеснай трапезы з нябожчыкам. Пасля Радаўніца працягвалася ў хаце, дзе святкаванне было дастаткова разняволеным і нават вясёлым.

З язычніцкай даўніной звязаны Ляльнік (22 кркасавіка) – свята вясны у гонар багіні вясны, апякункі дзяўчын Лялі (магчыма, дачкі Лады). 23 красавіка святкавалася буйное свята вясеннега цыклу – Юр’я, Ягорый – дзень першага выгану жывёл у поле. Святы Георгій (Юр’я) замяніў у народнай свядомасці старажытнага язычніцкага бога плоднасці, сонца, ваярскай справы Ярылу, а яшчэ раней уяўляўся ў выглядзе сакральнага старога ці белага воўка, што сведчыць аб глыбокай даўніне вобраза. У вяснянках Юр’я адчыняў неба і зямлю, сімвалізуючы пачатак новага гадавога жыццёвага цыклу.

Вельмі значным рухомым святам, звязаным з Вялікаднем, быў Духаў дзень, Троіца, у язычніцкай традыцыі – Сёмуха, якая прыходзілася на пяцідзясяты дзень пасля Вялікадня. Хрысціяне святкавалі Пяцідзясятніцу ў гонар з’яўлення вучням Хрыста Святога Духа ў выглядзе вогненых праменняў. У язычнікаў гэта было свята веснавой зелені, раслін, “мая” (зялёных галін ці рытуальнага дрэва).

Лета ў сялянскім календары было часам працы і таму абраднасць была прадстаўлена найбольш значнымі святамі. Цэнтральнае з іх – Купалле (ноч з 23 на 24 чэрвеня ці з 6 на 7 ліпеня), – дзень летняга сонцастаяння, калі была самая кароткая ноч у гаду. Свята прысвечана боству яскравага, жвавага сонца, плоднасці Купале (у мужчынскай і жаночай іпастасі, а таксама Купалішу). Хрыс-



РЕПОЗИТОРИЙ ИСЗ

